# ОРГАНЫ ПРАВАТВОРЧАСЦІ Ў СТАРАЖЫТНЫХ БЕЛАРУСКІХ КНЯСТВАХ І ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

**Т. І. Доўнар, Т. У. Іванова**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, theory-law@bsu.by*

Адзначана, што ў старажытных княствах паўнамоцтвы князей засяроджваліся галоўным чынам у выканаўча-распарадчай сферы, а правам прыняцця законаў часцей валодала веча. З утварэннем Вялікага Княства Літоўскага актывізуецца праватворчая дзейнасць вялікага князя і паноў-рады, а з канца XV ст. – сойма. Нарматыўныя акты становяцца важнейшай крыніцай права, удасканальваецца юрыдычны тэрміналагічны апарат, афармляецца дзяржаўная канцылярыя.

***Ключавыя словы*:** Беларусь; старажытныя княствы; Вялікае Княства Літоўскае; органы праватворчасці; канцылярыя.

# ОРГАНЫ ПРАВОТВОРЧЕСТВА В ДРЕВНИХ БЕЛОРУССКИХ КНЯЖЕСТВАХ И ВЕЛИКОМ КНЯЖЕСТВЕ ЛИТОВСКОМ

**Т. И. Довнар, Т. В. Иванова**
*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, theory-law@bsu.by*

Отмечено, что в древних княжествах полномочия князей сосредоточивались главным образом в исполнительно-распорядительной сфере, а правом принятия законов чаще обладало вече. С образованием Великого Княжества Литовского активизируется правотворческая деятельность великого князя и панов-рады, а с конца XV в. – сейма. Нормативные акты становятся важнейшим источником права, совершенствуется юридический терминологический апарат, оформляется государственная канцелярия.

***Ключевые слова*:** Беларусь; древние княжества; Великое княжество Литовское; органы правотворчества; канцелярия.

# LAWMAKING BODIES IN THE ANCIENT BELARUSIAN PRINCIPALITIES AND THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA

**T. I. Dovnar, T. V. Ivanova**
*Belarusian State University,*
*4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, theory-law@bsu.by*

The article emphasizes that in the ancient principalities the powers of the princes were concentrated mainly in the executive and administrative sphere, and the veche often had the right to pass laws. With the formation of the Grand Duchy of Lithuania, the law-making activities of the Grand Duke and the Rada (from the end of the 15th century, the

Sejm) intensified. Regulatory acts became the most important source of law, the legal terminological apparatus was improved, and the state office was formalized.

***Keywords:*** Belarus; ancient principalities; Grand Duchy of Lithuania; law-making bodies; the state office.

Старажытныя навукоўцы адзначалі спецыфіку арганізацыі жыцця насельніцтва Усходняй Еўропы. Так, візантыйскія гісторыкі яшчэ ў VI ст. адзначалі, што ў грамадскай арганізацыі ўсходніх славян ёсць некалькі груп, якія кіруюцца племяннной знаццю на чале з адным чалавекам і што жывуць яны ў народапраўстве і іх нельга схіліць да рабства або падпарадкавання [1, с. 23–26.]. Гэтая асаблівасць праяўлялася і пазней.

З узнікненнем старажытных княстваў ва Усходняй Еўропе фарміруюцца органы ўлады, адной з функцый якіх з'яўляецца праватворчасць. Навукоўцы пазначаюць, што ў большасці гэтыя княствы не набылі завершанага манархічнага ўладкавання і на працягу ўсяго існавання мелі схільнасць да народаўладдзя. На падставе звычайнага права і абшчыннага спосабу гаспадарання ў іх склалася даволі ўстойлівая сістэма публічнай улады, асноўнымі элементамі якой выступалі інстытуты непасрэднай дэмакратыі і абшчынна-вечавога самакіравання ў гарадах і сельскай мясцовасці. Праяўляўся пэўны дуалізм палітычнага ўладкавання, які спалучаў цеснае ўзаемадзеянне і ўзаемасувязь манархічнага (у асобе запрошанага або спадчыннага князя) і дэмакратычнага (у асобе народных вечавых сходаў) элементаў. Навукоўцы адзначалі, што вечавыя сходы свабодных людзей як найбольш старажытныя органы дзяржаўнай улады, існаваўшыя амаль ва ўсіх славянскіх дзяржавах, у тым ліку ў ноўгарадцаў, смалян, кіяўлян, палачан і інш., засяроджвалі ў сабе праватворчую, адміністрацыйную і судовую ўлады [гл., напрыклад: 2, с. 64].

У тым ліку ў беларускіх княствах сістэма органаў публічнай улады ўяўляла сабой сукупнасць трох асноўных дзяржаўна-палітычных інстытутаў: князь, рада (дарадчы орган пры князі) і веча. Старажытнае веча ўяўляла сабой, як правіла, агульны збор дарослых вольных мужчын. Як сведчаць летапісы, яно існавала ў Полацку, Віцебску, Друцку, Тураве і іншых месцах. Кола пытанняў на вечы строга не вызначалася. Хоць часцей веча склікалася па ініцыятыве князя, аднак часам яно збіралася самім народам і без князя самастойна вырашала ўсе пытанні, у тым ліку і самыя важныя ў дзяржаве. Часцей веча вырашала найбольш важныя дзяржаўныя справы: абранне і зняцце з пасады (выгнанне) князя, прызначэнне на пасады вышэйшых службовых асоб і пазбаўленне іх гэтых пасад, пытанні вайны і міру, міжнародныя адносіны, арганізацыя апалчэння і абароны, падаткі, судовыя справы. Патрэбна падкрэсліць, што суд з самага старажытнага часу традыцыйна адбываўся публічна, з удзелам народа. У сувязі з гэтым З. М. Чарнілоўскі пісаў: «община ока-

залась настолько универсальным инструментом улаживания коллективных дел и конфликтов, что ее... удерживает и феодальное право» [3, с. 18]. Многія расійскія навукоўцы адзначалі, што веча – гэта орган старажытнага «русского народоправства» і склікаць веча азначала прадставіць справу на абмеркаванне ўсяго народа. Так, В. О. Ключэўскі лічыў, што адзінаўладдзе ў старажытнай Русі да сярэдзіны XI ст. увогуле было палітычнай выпадковасцю і пасля смерці Яраслава Мудрага больш не паўтаралася [5, с. 169–170]. Аднак навукоўцы часам разыходзіліся ў пытаннях сутнасці «веча», яго складу, тэрыторыі дзейнасці, кола разглядаемых пытанняў. Пры гэтым большасць навукоўцаў падкрэслівала значную ролю веча ў жыцці старажытных дзяржаў.

Аб значэнні веча ў дзяржаўным жыцці, паўнамоцтвах і моцы на беларускіх землях сведчыць той факт, што толькі зацверджаны вечам князь лічыўся легітымным. Так, у 1127 г. быў выгнаны вечам полацкі князь Давыд. Полацкае веча і пазней выганяла непажаданых князёў (1128, 1132, 1151, 1159 гг.), а самі палачане «в той час волно собе пановали и жадной зверхности над собою не мели..., держали на той час землю Рускую сами мещане полоцкие… взявши кшталт справованя речи посполитой от оных славных справ грецких афинеов…» [4, с. 20]. Таксама адзначым тое, што Полацкае веча працягвала дзейнічаць амаль да канца XV ст. у складзе Вялікага Княства Літоўскага. Водгукі яго паўнамоцтваў мы знаходзім у многіх помніках права ВКЛ XV–XVI стст., дзе, у прыватнасці, гаворыцца аб правах усіх людзей і выбранні князёў ўсім народам. Напрыклад, граматай вялікага князя Полацку 1511 г. рэгламентавалася, што полацкі ваявода выбіраецца самімі палачанамі, а «который нелюб им – ино ему чист, иного избрати с полочан по испросу»; граматай 1447 г. вялікі князь абавязваўся захоўваць «ўсе правы, вольнасці і граматы», выдадзеныя не толькі свецкім і духоўным феадалам, але «гарадам, мяшчанам, жыхарам і наогул асобам усіх саслоўяў і стану» [6, с. 52, 89]. Аднак зразумела, што ў гэты перыяд нормы аб захаванні правоў і вольнасцей усяго народа былі ўжо пэўнай данінай «старыне» і мелі яны ў большасці дэкларатыўны і прапагандысцкі характар.

У працэсе складвання Вялікага Княства Літоўскага, палітыка-эканамічным цэнтрам якога сталі беларускія землі, актывізуецца праватворчая дзейнасць вышэйшых уладных органаў дзяржавы – спачатку вялікага князя і рады, а некалькі пазней – сойма, хоць звычай доўгі час застаецца важнейшай крыніцай права. У гэты перыяд звычай, які выпрацоўваўся самім народам, застаецца галоўнай крыніцай права, хоць і павялічваецца значэнне рэлігійных крыніц права і міжнародных дагавораў з іншымі дзяржавамі, перш за ўсё з Польшчай. Пры гэтым ужо

ў XV ст. прымаецца шмат нарматыўных актаў, на падставе якіх пачынае складвацца агульнадзяржаўнае заканадаўства.

Са станаўленнем дзяржавы паступова ўзмацняецца роля і праватворчая дзейнасць рады (паноў-рады). Прывілеям (граматай) 1492 г. увогуле ўстанаўліваецца, што вялікі князь без згоды рады не можа вырашаць дзяржаўныя пытанні і прымаць новыя законы. У той жа час узнікае і такая дзяржаўная практыка, калі з мэтай падтрымкі рашэнняў рады большасцю землеўласнікаў на пасяджэнне рады запрашаюцца іншыя шматлікія феадалы. Пачатак склікання больш шырокіх нарад феадалаў – фактычна пашыранага пасяджэння рады – навукоўцы адносяць прыкладна да канца XIV ст.

Паступова, разам са станаўленнем саслоўнага падзелу грамадства гэтыя сходы феадалаў пераўтвараюцца ў сойм – саслоўна-прадстаўнічы орган шляхты з даволі шырокімі паўнамоцтвамі, у тым ліку заканадаўчымі. Навукоўцы адзначаюць як агульнадзяржаўны, вальны сойм перш за ўсё віленскі сойм 1401 г., на якім вырашалася пытанне аб новай уніі з Польшчай, а асабліва – віцебскі з’езд шляхты 1433 г., на якім князі, паны, рыцарства і мяшчане звярнуліся са скаргай на вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча да рымскага папы, а таксама віленскі з’езд 1446 г., які займаўся магчымасцю абрання на польскі трон вялікага князя Казіміра [7, с. 61]. Калі спачатку сойм у большасці меў значэнне органа дарадчага, то паступова ён набывае нарматворчыя функцыі, а пры Казіміры ён становіцца вялікім вальным соймам з пераважнымі заканадаўчымі паўнамоцтвамі.

З сярэдзіны XVI ст. узмацніўся рух шляхты за павелічэнне сваіх правоў і гэтыя патрабаванні яна аформіла на палявым (т. зв. абозным) сойме пад Віцебскам у 1562 г., што паклала пачатак істотным палітычным рэформам і заканадаўчай рэгламентацыі дзейнасці сойма. У сувязі з гэтым спачатку Віленскі прывілей 1565 г., а потым Статуты 1566 і 1588 гг. сваімі нормамі ўсё больш удакладняюць дзейнасць сойма. Адначасова афармляецца і больш дакладнае падзяленне яго на дзве палаты (т. зв. станы, або колы): кола паноў-рады і рыцарскае (шляхецкае) кола, якія абмяркоўваюць пытанні спачатку асобна, а потым сумесна. Пры абмеркаванні законапраектаў усе дэпутаты мелі права выказаць сваю думку, а пры разыходжанні іх рабіліся спробы прымірыць бакі і ўзгадніць прапановы, што прыводзіла да замаруджвання работы сойма, які часам працаваў па некалькі месяцаў. Рашэнні прымаліся, як правіла, большасцю галасоў. Пры гэтым нельга не адзначыць, што ў нарматворчай дзейнасці сойма часта праяўляўся прынцып – што вырашае вялікі князь і паны-рада, тое шляхта прымае да выканання [7, с. 62].

Заканадаўчая дзейнасць у той час была цесна звязана з выканаўча-распарадчай і судовай дзейнасцю, таму ад імя вялікага князя і рады ўвесь час заключаліся международныя дамовы, даваліся інструкцыі паслам, ажыццяўлялася кіраўніцтва цэнтральнымі і мясцовымі органамі кіравання, а таксама судовымі органамі. Усе гэтыя дзеянні афармляліся ў выглядзе дагавораў, інструкцый, лістоў, грамат, прывілеяў, устаў, універсалаў, артыкулаў, выракаў і дэкрэтаў. Увогуле нарматыўныя акты, колькасць якіх усё больш павялічваецца, у залежнасці ад іх значэння, зместу, спосабаў іх прыняцця, а таксама тэрыторыі дзейнасці і кола ахопленых законам асоб, мелі розныя назвы: ухвала, устава, грамата, ліст, прывілей, статут, канстытуцыя, універсал, артыкул і інш. [7, с. 101]. Выразнага размежавання паміж гэтымі тэрмінамі не існавала і часам гэтыя паняцці выкарыстоўваліся як сінонімы, хоць пэўныя сэнсавыя адценні ўтрымліваліся ў кожным найменні. Так, нарматыўныя акты, якія выдаваліся ад імя вялікага князя ў сферы гаспадарчага права называліся ўставамі, у ваеннай сферы і адносна падаткаў на ваенныя патрэбы – універсаламі, акты ваенна-крымінальнага права – артыкуламі і г. д. Акты, якія прымаліся на сойме, часцей менаваліся ўхваламі, статутамі, пастановамі, а ў XVII–XVIII стст. – канстытуцыямі.

Законапраектная праца засяроджвалася ў вялікакняжацкай канцылярыі, а пры падрыхтоўцы буйных законапраектаў ствараліся спецыяльныя соймавыя камісіі (напрыклад, пры падрыхтоўцы Статутаў 1529, 1566, 1588 гг.), якімі, як правіла, кіравалі канцлер або падканцлер дзяржавы. Да працы над праектам прыцягваліся юрысты-практыкі і навукоўцы. Патрэбна адзначыць, што заканадаўца таго часу ў сувязі з недастатковым развіццём юрыдычнай тэхнікі быў яшчэ не зусім дакладны ў сваіх тэарэтычных вызначэннях. Аднак з тэкста нарматыўных актаў другой паловы XVI ст. бачна, што, нягледзячы на недакладнасць і грувасткасць канструкцый прававых нормаў, шматслоўе, паўтарэнне палажэнняў і г. д., ён ужо дастаткова добра ўсведамляў асноўныя юрыдычныя паняцці і карыстаўся даволі ўсталяваным юрыдычным апаратам. Асабліва гэта характэрна для так званага статутнага перыяду развіцця заканадаўства, які характарызаваўся высокім узроўнем сістэматызацыі права і прыярытэтам кадыфікаванага закона [7, с. 137–138 і інш.].

На працягу XV–XVI стст. у сувязі з павелічэннем колькасці нарматыўных актаў і дакументазвароту ў дзяржаве афармляецца і канцылярыя ВКЛ. З’яўленне вялікакняжацкай канцылярыі навукоўцы адносяць да часоў княжання Вітаўта (1390–1430), а працэс яе пераўтварэння з прыдворнага ў агульнадзяржаўны інстытут адбыўся прыкладна за 60–70 гадоў [8, с. 177]. На гэты працэс паўплывалі розныя прававыя і арганіза-

цыйныя фактары, якія ўзмацнялі ролю і вагу пісьмовага дакумента ў грамадска-палітычным і эканамічным жыцці дзяржавы. Падчас княжання Казіміра (1440–1492) канцылярыя набывае функцыі цэнтральнай дзяржаўнай установы. У сярэдзіне XV ст. адбываецца пэўнае вылучэнне прыватнагаспадарскай канцылярыі і афармляецца агульнадзяржаўная канцылярыя. Канцылярыя ж канца XV ст. – першай паловы XVI ст. мела ўсе рысы цэнтральнай дзяржаўнай установы [8, с. 178]. Адначасова беларускія і замежныя навукоўцы (А. Вішнеўскі, А. Груша, Х. Яблонскас, Я. Юхо і інш.) адзначаюць, што характэрнай асаблівасцю канцылярыі ВКЛ быў моўны білінгвізм, бо асноўныя агульнадзяржаўныя акты пісаліся па-лацінску і дубляваліся па-старабеларуску. Як адзначае А. Груша, да рэарганізацыі канцылярыі ў 1512 г. і ў 1522–1523 гг. колькасць «рускіх» пісараў пераўзыходзіла колькасць лацінскіх у два разы [9, с. 295].

У XVII–XVIII стст. у сувязі з эканамічным і сацыяльна-палітычным развіццём дзяржавы і з больш цеснымі, унійнымі адносінамі з Польшчай праватворчая дзейнасць у асноўным засяроджваецца ў сойме Рэчы Паспалітай. Аднак прымаюцца нарматыўныя акты і ў ВКЛ. Пры гэтым дзейнасць усіх галін улады значна ўдасканальваецца, што знаходзіць адлюстраванне ў значным павелічэнні і стварэнні шэрагу адпаведных комплексаў дзяржаўных дакументаў [10, с. 11–12]. Гэта тычыцца і нарматыўных актаў, у тым ліку ўзнікнення новых іх відаў, уніфікацыі і выпрацоўцы больш дакладнага тэрміналагічнага апарату. Адначасова рэфармуецца дзейнасць канцылярыі ВКЛ, якая арганізацыйна і функцыянальна падзяляецца на большую і меншую з вызначэннем іх больш канкрэтных абавязкаў і правамоцтваў. У іх ліку яна займаецца прывядзеннем у сістэму і фармальным удасканальваннем заканадаўчай, распарадчай і судовай дакументацыі.

У якасці заключэння зробім асноўны вывад: калі ў старажытных дзяржавах Беларусі галоўным праватворчым органам з’яўлялася веча, то з утварэннем Вялікага Княства Літоўскага – буйной феадальнай дзяржавы, палітыка-эканамічным цэнтрам якой былі беларускія землі, такім органам спачатку з’яўляецца вялікі князь, рада і паны-рада, а пазней – сойм. У склад сойма ўвайшлі не толькі рада і вялікі князь, але і прадстаўнікі шляхецкага саслоўя, што выбіраліся на павятовых сойміках. Праватворчая функцыя сойма на працягу стагоддзяў узмацняецца. Пры гэтым з павелічэннем ролі нарматыўнага акта ў сістэме крыніц права значна павялічваецца дакументаабарачэнне, прычым як у сферы заканадаўчай, так распарадчай і судовай дзейнасці, адпаведна чаму развіваецца тэрміналагічны апарат. Паралельна гэтаму праходзіць працэс афармлення дзяржаўнай канцылярыі: павялічваецца

штат супрацоўнікаў з канкрэтызацыяй іх абавязкаў і правамоцтваў; адбываецца падзел на пэўныя часткі (большую, меншую і інш.); удасканальваецца справаводства, у тым ліку ўдакладняюцца формы дакументаў, формы іх захоўвання і інш. У выніку – канцылярыя набывае функцыі сапраўднай цэнтральнай дзяржаўнай установы Вялікага Княства, што значна садзейнічае працэсу праватворчасці.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Белоруссия в эпоху феодализма: в 3 т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории, Арх. упр. МВД БССР ; редкол.: А. И. Азаров [и др.]. Минск : АН БССР, 1959–1961. Т. 1. Мінск, 1959. 516 с.

2. *Юхо Я. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск : Універсітэцкае. 270 с.

3. *Черниловский З. М.* Русская Правда в свете других славянских судебников // Древняя Русь: проблемы права и правовой идеологии : сб. науч. тр. М. : Изд-во РИО ВЮЗИ., 1984. С. 3–28.

4. Хроника Литовская и Жемойтская // Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32. С. 16–127.

5. *Ключевский В. О.* Соч. В 9 т. Т. 1. Часть 1. Курс русской истории. М. : Мысль, 1987. 432 с.

6. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права : дапаможнік / Я. Юхо, А. Абрамовіч, Т. Доўнар, У. Сатолін. Мінск : БДУ, 2000. 127 с.

7. *Доўнар Т. І.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік. 3-е выд., стэр. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2023. 432 с.

8. *Скеп'ян Н.* Фарміраванне цэнтральных органаў улады ВКЛ на прыкладзе інстытутата канцлера // Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура : зб. навук. арт. : у 2 ч. Ч. 1 / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад А. А. Скеп'ян ; рэдкал.: У. Р. Гусакоў [і інш.]. Мінск : Беларуская навука, 2017. 506 с.

9. *Груша А. И.* Документальная письменность Великого Княжества Литовского (конец XIV первая треть XVI в.). Минск : Беларуская навука, 2015. 465 с.

10. *Дернович Е. П.* Делопроизводство в высших органах власти Великого Княжества Литовского (1696–1795 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 05.25.02 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 2023. 22 с.